Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

БЕЛАРУСКІ ЗВОН

Радыкальная часапісь, выходзіць 4 разы ў месяц

Цана асобнага нумару 15 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі Вільня, Вострабрамская 9.
Прыймо інтэрэсантаў ад 10 да 2 г. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

ПАДПІСКА з дастаўкай да хаты: на 1 год 4 зл 50, за паўгоду 2 зл. 40, за 3 месяцы 1 зл. 30, за 1 месяц — 50 гр.

Год II. Вільня, 27 лютага 1932 г. № 8 (33)

Популярна-навуковыя лекцыі

ладжаныя Лекцыйнай Камісіяй Беларуск. Навук. Таварыства.

У нядзелю, 28 лютага — замест адкладзенае на пазьней лекцыі УЛ. САМОЙЛЫ на тэму: „Аб беларускім мастацтве" — прачытана будзе лекцыя Р. Астроўскага на тэму: **Новая арганізацыя школьніцтва ў Польшчы і беларускія школы.**

Лекцыя чытаецца ў салі Віленскае Беларускае Гімназіі (ВОСТРАБРАМСКАЯ 9).

Пачатак у 4 гадз. вечара —) (— Уваход вольны і бясплатны

Школьныя перспэктывы.

Зьмяшчаючы ў папярэднім нумары нашае газэты перасьцярогу кіраўнікоў Навагрудзкае Беларускае Гімназіі, якія маняцца дабівацца перад уладамі, каб урад „упаньствовіл" гэту гімназію, мы пісалі, што пытаньне, у якіх варунках прыдзецца працаваць *прыватным* школам у Польшчы ў наступным учэбным годзе, яшчэ ня выясьнена. Цяпер гэтае пытаньне—ужо выясьняецца. А тое, што выясьняецца, выклікае ў нашым грамадзянстве новую трывогу за быт *апошніх* нашых навучальных пляцовак — прыватных беларускіх гімназіяў у Вільні і Навагрудку.

Соймавая камісія ўжо разглядае ўрадавы законапраект аб арганізацыі *прыватнага* школьніцтва. Закон гэты, па ўваходзе ў жыцьцё, створыць новыя падставы існаваньня для прыватных школаў, у тым ліку для сярэдніх, лічба якіх у Польшчы значна перавышае лічбу ўрадавых сярэдніх школ. Гэтак на агульную лічбу 777 гімназіяў прыпадае прыватных гімназіяў ажно 501, на 237 сэмінарыяў —прыватных 201, на 477 прафэсіянальных школ—прыватных аж 369. Створыць ён і новыя варункі бытаваньня для гэных дзьвюх беларускіх прыватных гімназіяў, якія—з увагі на „одхлопене" (словы „Gaz. Warsz.") урадавых гімназіяў на падставе новае арганізацыі дзяржаўнага школьніцтва — астаюцца *адзінай* „*аддушынай*" *для дзяцей беларускага сялянства.*

Новы закон перад усім дае *неабмежаную ўладу міністру асьветы* над прыватнымі школамі, блізу не пакідаючы фізычным ці юрыдычным асобам—уласьнікам школаў—ніякага ўплыву на ўтрымліваныя імі школы. Міністар можа ў кожны мамэнт зачыніць школу, выдаліць яе дырэктара і вучыцялёў, калі „сьцьвердзіць", што яны „аказваюць на вучняў ад'емны ўзгадаваўчы ўплыў". І гэткая пастанова міністра — *безапэляцыйная.*

Другі асабліва важны пункт новага закону—той, што з мамэнтам прыняцьця яго ўсе прыватныя школы, навет даўно існуючыя, губляюць старыя канцэсіі і *мусяць атрымаць новыя канцэсіі, як школы нова адкрываныя.* Пры гэтым для канцэсіянераў устанаўляецца цэлы рад нязвычайна цяжкіх варункаў, выпаўніць каторыя беларускае грамадзянства *невядома, ці здолее:* яны датычаць *матэрыяльнага забясьпечаньня школаў іх канцэсіянерамі* і зусім ня прымаюць пад увагу, што — прыкладам — беларускія гімназіі існуюць дзякуючы згодзе вучыцельскага пэрсонэлю атрымліваць мінімальную плату за сваю працу, або і зрачыся ўсякае платы!. Ня прымаюць пад увагу і таго, што беларускія гімназіі, утрымліваныя Бацькоўскімі Камітэтамі, сябры якіх — пераважна сяляне, *ня могуць мець неабходных капіталаў* дзеля „матэрыяльнага забясьпечаньня" школ. І гэта — найвялікшая пагроза нашаму прыватнаму школьніцтву з боку новых законаў.

Урэшце, ёсьць яшчэ адзін мамэнт, які тут гожа адзначыць у ўрадавым законе. Гэта — *варункі прыйма вучыцялёў.* Дагэтуль школьныя ўлады, адкідаючы цэлую масу зусім добрых беларускіх вучыцельскіх сілаў, грунтаваліся на тым, што беларускія вучыцялі ня маюць вымаганых *польскіх кваліфікацыяў пэдагогічнага характару.* Цяпер, калі мы маем ужо дзесяткі дыплёмаваных у польскіх унівэрсытэтах кандыдатаў на вучыцельскія пасады, новы закон на першае месца стаўляе *кваліфікацыі палітычныя.* Гэта ёсьць: „ненаганная" лёяльнасьць і маральнасьць, устанаўляць якія будзе — адміністрацыйная ўлада.

Ясна, што ў такіх абставінах для беларусаў губляюць усялякую сілу тыя гарантыі, якія ім дадзены і 110-ым параграфам польскае канстытуцыі, і вэрсальскім трактатам і 7 ым артыкулам рыжскае ўмовы ды маюць забясьпечваць магчымасьць разьвіваць родную мову і сваю нацыянальную культуру. Адгэтуль — толькі воля міністра асьветы будзе вырашаць усе падобныя пытаньні. Адгэтуль — толькі *ад агульнага кірунку ўрадавае палітыкі будзе залежаць магчымасьць беларуск. нацыянальнае працы.*

У якім кірунку пойдзе польскі ўрад у беларускім пытаньні? Ніжэй зьмешчаны мэморыял Цэнтрасаюзу вымагае ад польскага ўраду яснага і вычэрпываючага адказу.

Бацькі!

Навучайце дзяцей вашых чытаць і пісаць пабеларуску!

Закон аб далейшым асадніцтве на землях украінскіх і беларускіх.

Падаем—паводле „Діла"—зьмест новага закону аб вайсковым асадніцтве.

Новы колёнізацыйны закон, прыняты Соймам, кажа, што міністар зямляробства можа перадаць на мэты ваеннага асадніцтва з некаторых ужыткаў з дзяржаўных лясоў на украінскіх і беларускіх землях, якія маглі-б быць выраблены пад ральлю, тыя дзялянкі, каторыя для ўпраўленьня дзяржаўных лясоў не канешне патрэбны. (§ 1 законапраекту).

Такім чынам новы закон стварае новы зямельны запас на „крэсах" для вайсковай колёнізацыі, не прадбачаны законамі 1920 і 1930 г.г.

§ 2 ўрадавага законапраекту дамагаецца, каб вайсковыя асаднікі, якія мелі атрымаць на аснове закону 1920 г. зямлю дарма, але не атрымалі яе тады, бо ўся зямля, назначаная тады пад вайсковую колёнізацыю, была вычарпана, ды якія з гэтай прычыны (бяспраўна) аселі на землях, празначаных на парцэляцыю, — каб гэтыя асаднікі атрымалі цяпер бясплатна зямлю, празначаную на парцэляцыю сярод мясцовага насяленьня.

Далей § 2 кажа, каб жаўнерам, якім бяспраўна дадзена ў арэнду зямля, празначаная не на вайсковую колёнізацыю, але на парцэляцыю сярод мясцовага насяленьня, таксама аддаць гэтую зямлю на ўласнасьць.

§ 3 законапраекту трэбуе, каб ваенным колёністам, надзелы каторых Зямельныя Управы прызнаюць нягоднымі да сельскагаспадарчага ўжытку, даць лепшыя надзелы— з дадаткам па 500 злотых на кошты перасяленьня. Звольненыя-ж з-пад былых сялібаў гэтых колёністаў землі мае атрымаць урад назад, каб выкарыстаць іх пад пасеў лесу.

У часе дыскусыі над гэтым § дакладчык камісіі запрапанаваў, каб у дадатку яшчэ ўрад дараваў колёністам усе нясплачаныя пазыкі іх у дзяржаўных банках, узятыя на іх гаспадаркі.

§ 4 закону прадбачыць такую дармовую раздачу зямлі ня толькі паасобным асаднікам, але і іх арганізацыям.

§ 5 прадбачыць аддачу ваенным колёністам ня толькі гэтых лепшых надзелаў зямлі, але дамоў, усіх будоўляў, лясоў, садоў і ўсялякіх іншых падобных ужыткаў, якія апынуцца на раздаванай зямлі, — без усялякай дадатковай заплаты.

§ 6 забараняе ваенным асаднікам аддаваць свае надзелы ў арэнду іншым асобам. Але дакладчык запрапанаваў дазволіць аддачу ў арэнду ня больш, як на 6 гадоў.

§ 7 кажа, што ўсе грошы, патрэбныя на правядзеньне гэтага закону ў жыцьцё, будуць узяты з фонду, каторы назначаны на зямельную рэформу для мясцовага насяленьня.

§ 10 паўтарае, што новая вайсковая колёнізацыя мае быць праведзена выключна на тэрыторыі украінскай і беларускай. З свайго боку дакладчык дадаў яшчэ і непрадбачаныя ў праекце 2 беларускія паветы Беластоцкага ваяводзтва.

У камісіі проці гэтага закону выступаў толькі прадстаўнік украінцаў дэп. Луцкі. Украінскі клюб у зьвязку з праектам зьвярнуўся навет да Лігі Нацыяў з скаргай. Гэта выклікала ў камісіі гнеўную заяву з боку абуранага мін. Козловскага: „Ёсьць два шля-

хі для палітычных справаў: першы — тутака ў краі, другі—замежны—да Лігі. Вы, украінцы, выбралі другі. Дык я проста ня прымаю да ведама прамовы дэп. Луцкага і не ўдаюся з ім ні ў якую палеміку".

Пасьля гэтай заявы п. міністра пасол Луцкі заявіў, што больш ня можа прымаць учасьця ў працы камісіі.

Праект быў прыняты камісіяй галасамі ўсіх польскіх партыяў, не выключаючы й апазыцыі.

Усё гэта — зусім неспадзяваны адказ на спадзяваньні шырокіх колаў нашага сялянства, уьц ж галадаючага з прычыны недахопу зямлі дый слушна чакаючага на тое, што першым чынам павінны быць — на падставе існуючых законаў—заспакоены яго жыц цёвыя патрэбы.

Вайна Японіі з Кітаем.

Апошняя спроба міравое разьвязкі.

Кітай зрабіў апошнюю ўжо хіба ж спробу зьвярнуцца да Лігі Нацыяў—дзеля міравое разьвязкі канфлікту з Японіяй. Атрымаўшы японскі ультыматум, Кітай патрэбаваў скліканьня экстрэннага паседжаньня Рады Лігі, на якім яго дэлегат далажыў аб новай пагрозе вялікага праліцьця крыві і запытаўся, ці лічыць Рада ўрэшце сваім абавязкам рашуча ўмяшацца—на падставе статуту—у гэту справу?

Нажаль Рада ня толькі не захацела ў апошні мамэнт працідзеяць крывавай бойні, але і закончыла паседжаньне пастановай — трагі-комічнай. Як ведама, Кітай трэбаваў, каб Рада склікала Агульны Збор Лігі, рахуючы на тое, што можа ён патрапіць здабыцца на больш рашучую „мову" з Японіяй. Дык вось Рада, ня гледзячы на пратэсты Японіі, пастанавіла склікаць гэты Збор, — на 3 сакавіка.

Новае наступленьне японцаў.

У суботу ў паўвосмай гадзіне раніцы скончыўся тэрмін японскага ультыматуму Кітаю, і пачалося агульнае наступленьне японскіх войскаў на ўсім шанхайскім фроньце. Ля Шанхаю сабрана блізу 50-тысячная японская армія, цяжкая артылерыя якой—поруч з гарматамі некалькіх дзесяткоў японскіх браняносцаў — распачала страшэнную бамбардоўку. З кітайскага боку быццам сабрана пад Шанхаем аж 200-тысячная армія, таксама з сільнай артылерыяй, танкамі, аэрапланамі і інш. Але такія вялізарныя кітайскія сілы ня могуць разгарнуць усіх сваіх магчымасьцяў, бо мясцовасьць страшэнна парэзана рачнымі „рукавам". Усё гэта дае вялікую перавагу японцам, маючым лепшае ўзбраеньне. Плян японскага наступленьня прадбачыць абход шанхайскіх украпленьняў — з захватам чыгункавай лініі Шанхай — Нанкін. Іншыя весткі кажуць, быццам японцы падрыхтавалі ўжо новую 80 тысячную армію дзеля паходу на Нанкін. Кітайскія войскі гэройска адбіваюць наступленьне, але апошнія весткі кажуць, быццам японцам удалося ўжо ўзяць з бою Кіянг-Ванг. Як бачым „вайна без вайны" разгарэлася надобра.

Кітайцы адкінулі японцаў.

Гэройскі апор кітайцаў ізноў папсаваў японскія мяркаваньні: японцы ня здолелі ўтрымацца на ўзятай імі з бою пазыціі ў Кіянг-Вангу. Кітайцы перайшлі ў наступленьне ды адкінулі японцаў назад. Японцы ураганным агнём абстрэлівалі Ша-Пэй, але — без рэзультатаў. З свайго боку кітайская артылерыя зрабіла вялікія спустошэньні ў японскім войску і абстраляла японскую галоўную кватэру.

Характэрна, што на проці - японскім фроньце стаяць поплеч і гэройска б'юцца за Бацькаўшчыну арміі Кантонскага і Нанкінскага ўрадаў, якія дагэтуль бароліся між сабой. Арміямі камандуе супольны глаўнакамандуючы.

Кітайская перамога.

Кітайцы пад Кіянг-Ван перайшлі ад абароны ў наступленьне і разьбілі японцаў, якія былі прымушаны на гэтым адрэзку адступіць, ня гледзячы на тое, што сконцэнтравалі тут свае галоўныя сілы.

Галоўная каманда японскіх войск пастанавіла павялічыць лічбу сваей арміі ўдвая.

Абвяшчэньне „незалежнасьці" Манчжурыі.

18 лютага ў Мукдэне абвешчана „Незалежная" Манчжурская Дзяржава, па свайму дзяржаўнаму ладу—нешта сярэдняе паміж манархіяй і рэспублікай.

Паніка ў Маскве.

З Масквы пішуць, быццам тамака пераканаты ў няўхільнасьці вайны СССР з Японіяй. Праўда, маскоўскі ўрад пастанавіў за ўсялякую цану ўхіляцца ад вайны, уступіўшы навет часова (?) Японіі Усходня-Кітайскую чыгунку. Усё ж у Маскве разумеюць, што вайна не ляжыць у інтарэсах СССР. „Мы яшчэ не гатовы",—кажуць адны. „Вайна сарве пяцілетку",—кажуць другія. „Вайна, гэта—скок у прорву", — кажуць трэція: „у 1917 г. вайну мы ператварылі ў рэвалюцыю, а ці ж мала ёсьць сягоньня чыньнікаў, якія хацелі-б цяпер ператварыць вайну ў контр-рэвалюцыю?"...

Чаму-ж Масква лічыць вайну няўхільнай? Сталін, галоўны працаўнік вайны, заявіў, што, апроч вайны зачэпнай ды абароннай, ёсьць яшчэ трэці род вайны: **вайна з прымусу.** Бо ж СССР **можа быць прымушаны да вайны з Японіяй.** Дзеля гэтага ў СССР ідзе шпаркае падрыхтаваньне да вайны. Прадукты ўсялякага роду, асабліва збожжа блізу счэзьлі з рынку: урад гоніць адзін па адным поўныя цягнікі з імі на Далёкі Усход, зьбіраючы там у складах вялізарныя масы еміны. Насяленьне СССР падзялілася: адна частка спадзяецца перамогі і трыумфу бальшавіцкага ўраду; другая, хіба-ж шмат больш чысьленая, лятуціць аб канцы бальшавіцкага панаваньня... (*„Социяліст. Вестн."*).

Рашучы пералом у Англіі.

Англія, якая дагэтуль наагул спагадала японцам, запэўняючы, што ні ў якім выпадку не ўмяшаецца ў канфлікт, цяпер—пасьля страшэнных шкодаў, якія нарабіла японская бамбардоўка ў англійскай канцэсіі, рэзка зьмяніла свае становішча. Найбольш уплывовая газэта „Таймс", якая выражае заўсёды пагляды ўраду, піша ў нябывала вострым

Мэморыял Цэнтрасаюзу ў справе беларускіх школ.

20 лютага с. г. прэзыдыум Цэнтрасаюзу зьвярнуўся да міністра асьветы з гэткім мэморыялам у справе беларускіх школ, існаваньню якіх пагражае вельмі паважная небясьпека. Падаем тэкст мэморыялу ў дослоўным перакладзе, падчырківаючы важнейшыя мамэнты.

„Некалькі гадоў назад у школьнай палітыцы польскага ўраду быў распачаты новы курс, каторы як-быццам меў на мэце хоць у маленькай меры здаволіць слушныя, прынцыпова нікім не запярэчаныя дамаганьні беларусаў у школьнай галіне. Былі адчынены колькі дзесяткоў дзяржаўных народных школ — пераважна ўтраквістычных і толькі ў зусім малым ліку беларускіх. Дзеля забясьпечаньня неабходнага даплыву адпаведна выкваліфікаваных вучыцельскіх сілаў у Вільні была закладзена дзяржаўная вучыцельская сэмінарыя ім. Фр. Багушэвіча з польскай і беларускай выкладовай мовай пад кіраўніцтвам дырэктара-беларуса. Блізу ў тым-жа часе былі дадзены правы публічнасьці прыватным беларускім гімназіям у Вільні і ў Наваградку і вызначана ім ад міністэрства рэлігійных вызнаньняў і народнае асьветы дапамога ў пастаці вучыцельскіх этатаў па 7 на кожную.

„Гэтыя крокі ўнесьлі значнае ўспакаеньне ў беларускім грамадзянстве. Пачаўся пэрыяд спакойнае творчае працы на культурнай ніве, якая нэўтралізавала руйнуючыя ўплывы староньніх чыньнікаў, імкнуўшыхся выкарыстываць дзеля процідзяржаўных мэтаў нездаваленьне беларусаў варожай да іх палітыкай папярэдніх урадаў.

„На жаль, гэты пэрыяд пратрываў нядоўга. У 1931 годзе ўлада зьліквідавала прыватную беларускую гімназію ў Клецку, хаця ніякіх падставаў з пэдагогічнага боку дзеля гэтага ня было, і ўсё беларускае грамадзянства бяз розьніцы палітычных кірункаў горача апэлявала да найвышэйшых уладаў дзяржавы аб захаваньне гэтае заслужонае культурнае пляцоўкі. У восені таго-ж году зусім неспадзявана зроблены быў балючы **ўдар і двум другім беларускім гімназіям — у Вільні і ў Наваградку,** якім лічба вучыцельскіх этатаў была зьменшана да трох на кожную ды шмат паменшана дапамога грашмі, даваная гэтым школам з нацыянальнага аддзелу міністэрства ўнутраных спраў у папярэднія гады. Адначасна **беларускасьць дзяржаўных народных школ стаецца ўсё больш фікцыйнай.** Урэшце, у адносінах да дзяржаўнае вучыцельскае **сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча ў Вільні зроблены рад абмежаньняў,** зьмяншаючы да мінімума дзяржаўную дапамогу на ўтрыманьне інтэрнату пры гэтай сэмінарыі, што паставіла працу незаможных беларускіх дзяцей у вельмі цяжкія варункі.

„Гэтыя крокі дзяржаўнае ўлады выклікалі **ў беларускім грамадзянстве новую хвалю слушнага раздражненьня, а ў польскіх нацыяналістычных сфэрах — праявы шчырага здаваленьня.** У тых-жа сфэрах цяпер з усей упэўненасьцяй пашыраецца вестка, маючая ў сувязі з вышэйсказаным усе адзнакі праўдападобнасьці, што **школьная ўлада пастанавіла аканчальна зьліквідаваць з канцом бягучага школьнага году дзяржаўную вучыцельскую сэмінарыю ім. Фр. Багушэвіча,** што было б раўназначна з заявай, што справа **далейшага тварэньня ўрадавых народных школ з беларускай выкладовай мовай вырашана ўрадам у адмоўным кірунку.** А ў сувязі з агульнай перабудовай школьніцтва ў Польшчы крок гэты ня сулiць нічога добрага і існуючым яшчэ ў Польшчы двум беларускім гімназіям у Вільні і Наваградку.

„Атмосфэра бязупыннае пагрозы існаваньню гэтых школаў, якія — з прычыны сказаных крокаў улады—змагаюцца з нязвычайнымі труднасьцямі матэрыяльнага характару, **вельмі цяжка адбіваецца як на вучнях, так і на вучыцялёх.** Моладзь ня мае пэўнасьці, што ей удасцца дакончыць эдукацыю ў школе ў роднай мове; вучыцельскі пэрсонэль пераживае мамэнты цяжкога прыгнечаньня, бо ў выпадку ліквідацыі беларускіх сярэдніх школаў падчас агульнага крызісу ў Польшчы перад імі ўзьнімецца зданьнё голаду.

„У такую часіну беларускае грамадзянства ня можа аставацца збоку і гэтым звярачаецца да пана міністра з просьбай, каб **захацеў глыбей глянуць на справу беларускага школьніцтва і зрабіць позытыўную пастанову,** якая скранула бы з мёртвага пункту гэтую надзвычайна балючую справу, забясьпечываючы беларускаму жыхарству прыналежнае яму паводле абязываючых законаў **права на навуку ў матчынай мове,** а таксама даючы магчымасьць прыватным беларускім гімназіям у Вільні й Наваградку ды дзяржаўнай вучыцельскай сэмінарыі ім Фр. Багушэвіча ў Вільні **весьці іх працу ў нармальных варунках,** каторыя не напаміналі-бы на кожным кроку беларускай моладзі аб яе пакрыўджаным палажэньні ў Польскай дзяржаве. Паводле нашага глыбокага перакананьня, гэтага вымагаюць у роўнай меры інтарэсы беларускага жыхарства, як і інтарэсы дзяржавы".

Не дадаем да гэтага мэморыялу ад сябе ніякіх комэнтарыяў: падаяыя ў ім факты гавораць самі за сябе даволі красамоўна. Будзем цяпер з напружанай увагай чакаць, які адказ дасьць пан міністар: з гэтага адказу будзе відаць, ці запраўды, як кажуць, урад пастанавіў ліквідаваць усё беларускае, ці гэта толькі польскія нацыяналістычныя сфэры няслушна прыпісываюць ураду гэткія імкненьні, каб гэткім чынам выклікаць у беларускіх масах варожасьць да яго.

тоне проці Японіі. З Лёндану пішуць, быццам англійскія ўрадавыя колы паважна разважаюць магчымасьць ваеннага выступленьня Англіі —проці Японіі.

Гутарка Лігі Нацыяў з Японіяй робіцца „гучнейшай“.

Пасьля прыняцьця трагі-камічнай рэзалюцыі аб скліканьні пленуму Лігі Нацыяў на май, 12 сяброў Рады Лігі (фактычна — уся Рада, толькі бэз дэлегатаў Японіі і Кітаю) выслалі да Японіі „заклік“ таксама ў нябывала яшчэ дагэтуль рэзкай форме, фармальна вінавацячы яе, як „напасьніка“, у канфлікце. „Заклік“ гэты выклікаў страшэннае абурэньне ў Японіі, урад якой усьцяж паўтарае, быццам гэта Кітай „напаў“ на Японію, а тая „толькі бароніцца“..

У адказ на гэты заклік японскі ўрад афіцыяльна адказаў, што дзівіцца, чаму „заклік“ зьвернены толькі да Японіі, чаму Рада лічыць „незаконнай ды нарушаючай трактаты й умовы“ высылку японскіх войск у Кітай, калі—„тое ж самае (?) зрабілі і іншыя дзяржавы“, дый чаму Рада Лігі пазываецца на нейкі „пакт Кельлёга“, які — „ня мае ніякага адносіньня да статуту Лігі“...

Адказ Японіі выклікаў страшэннае абурэньне ў колах Лігі Нацыяў.

У выніку ўсіх гэтых правакацыйных спрэчак, Японія ўсё больш губляе сымпатыі ў Лізе, хіба-ж толькі апрача Францыі. Дык магчыма ўмяшацельства ў канфлікт Англіі поруч з Амэрыкай. Да гэтага няўхільна вядзе Японія. Зразумела-ж, Англія з Амэрыкай хіба-ж крыху пачакаюць пакуль вайна добра падаб'е і мілітарную і фінансавую сілу Японіі, пасьля чаго гутарка з ёй будзе шмат лягчэйшая. Праўда — пакуль-што за гэтае „чаканьне“ страшэнна дорага плацяць пераважна кітайцы. Але яны бароняць сваю сьвятую справу. Дый ім выразна, блізу ўжо й не хаваючыся, памагаюць і Англія і Амэрыка,—зразумела-ж, пакуль што—прыватна...

S. M. S.

(Пісьмо з Варшавы).

У Варшаве нядаўна ўзнавіла сваю дзейнасьць „Stowarzyszenie Młodych Słowian“ („Аб'яднаньне Маладых Славянаў“). Арганізацыя гэтая, як славянафільская, мае на мэце навязаньне культурных сувязяў між славянскімі народамі і ад іншых пачынаньняў гэтага роду розьніцца тым, што зусім выразна і адкрыта заяўляе аб прызнаньні права на самастойнае існаваньне беларускага і украінскага народаў.

Беларуская колёнія ў Варшаве (праўда, лічэбна вельмі малая) прыняла даволі чыннае ўчасьце ў арганізацыі. Урад яе складаецца з наступных асоб: старшыня — А. Опэнховскі (паляк); віцэ старшыні — праф. Ю. Бэнэшіч, харвацкі поэта, і д-р Я. Нэбэскі, раднік чэхаславацкага пасольства ў Варшаве; сэкрэтар — Э. Госевскі (паляк); скарбнік — інж. А. Ільніцкі (украінец, эмігрант); вольны сябра — інж. Р. Земкевіч (беларус).

У сваей дзейнасьці арганізацыя імкнецца да знаёмленьня шырокіх колаў польскага грамадзянства з культурным жыцьцём усіх славянскіх народаў. Сярод сыстэматычна чытаных публічных лекцыяў у праграме на першую чвертку гэтага году бачым дзьве лекцыі аб беларусах: 25 га студня адбылася лекцыя грам. Мікалая Грыгаровіча на тэму: „Беларусы ў іх гістарычным разьвіцьці“ і на 22 лютага вызначана лекцыя грам. А. Опэнховскага на тэму: „Гісторыя беларускае прэсы“—у сувязі з нядаўна адбытым дваццаціпяцілетнім юбілеем яе. На апошню тэму гр. Опэнховскім была зьмешчана цікавая стацьця ў выдаваным у Празе чэскім месячніку „Slovansky Prehled“.

Праца S. M. S., вядзеная ў Варшаве, годна ўвагі яшчэ й дзеля таго, што ў сэрцы Зах. Беларусі, Вільні, паміж беларускім і польскім грамадзянствам няма ніякага кантакту, і віленскія палякі ведаюць аб жыцьці і культурных дасягненьнях беларусаў хіба не балей, чым... аб кітайцах!

К. Кандратовіч.

Жыцьцё Польшчы.

Законы аб палёгках пры спагоне падаткавых залегласьцяў.

Сойм прыняў рад новых законапраектаў, якія маюць на мэце ўрэгуляваць справу спагону падаткавых залегласьцяў, прымаючы пад увагу цяжкое палажэньне падатнікаў у сучасным крызісе. Прынятыя законы даюць міністру фінансаў вельмі шырокія правы адтэрміноўваць, зьмяншаць дый цалком касаваць падаткавыя залегласьці; з другога боку новыя законы концэнтруюць у руках міністра скарбу і парадкуюць усю справу прымусовага спагону падаткаў, маючы на мэце больш асьцярожна праводзіць гэтую акцыю, каб не руйнаваць падатнікаў.

Пасол Б. Б. проці высокіх цэнаў картэльных і манапольных прадуктаў.

Трэба адзначыць з апошняе бюджэтнае дыскусыі ў Сойме прамову пасла з Б. Б. Войцехоўскага, які слушна абураўся на тое, што ў часе агульнага крызісу, зьбядненьня спажыўцоў дый агульнага зьніжэньня цэнаў блізу на ўсе тавары, асабліва ж на прадукты сельскай гаспадаркі, дый на працу работніка —цэны на вырабы дзяржаўных манаполяў ды так званай „скартэлізаванай“ (аб'яднанай у картэлі—саюзы ўсіх прадуцэнтаў дадзенай галіны) прамысловасьці стаяць непарушна кладучыся страшэнным цяжарам на зьменшаны бюджэт шырокага спажыўца. Запраўды-ж— цэны вугальля, газы, цукру, солі, запалак, усялякіх мэталяў (ня кажам аб гарэлцы—хай сабе даражэе навет!) —значыць на ўсе рэчы, без якіх ня можа абыйсьціся ніхто,— стаяць, як сталі тады, калі жыта каштавала ў 3—4 разы больш, як цяпер П. Войцехоўскі абураўся на тое, што нехта намываецца страшэнна на гэтай народнай бядзе, казаў аб тым, што розныя дырэктары скартэлізаваных ды манапольных прадпрыемстваў маюць больш як паўмільёнавыя пэнсіі і г. д...

Урад павінен рашуча спыніць гэтыя запраўды-ж абураючыя рэчы, калі проці іх падыймаюць голас навет сябры ўрадавай партыі.

Хваляваньне работнікаў на Шлёнску.

На горным Шлёнску ўжо каля месяцу ідзе бесспыннае хваляваньне сярод работнікаў гарнякоў, выкліканае неспадзяванай пастановай вугальных ды мэталёвых „баронаў“ —зьменшыць самавольна, ламаючы гэтым падпісаныя ўмовы, плату работнікам на 25 проц. У выніку доўгіх забурэньняў, забастовак і ўмяшацельства ўраду — удалося неяк наладзіць „прамысловы мір“. Работнікі згадзіліся на зьмяншэньне платы на 8 проц. і выказаліся ў большасьці проці забастоўкі. Але наладжаны „мір“ нейкі „хворы“. Сярод работнікаў няма еднасьці. Усьцяж ідуць спорк і аб забастоўцы; выбухаюць забастоўкі ў паасобных раёнах, а ў суседніх раёнах праца йдзе. Ведама-ж, працуюць і „камуністы“. У апошні час пачалі ў паасобных копальнях выбухаць і пажары. Усё гэта прадстаўляе вялікую небясьпеку для Польшчы.

Крывавыя здарэньні на тэрыторыі забастоўкі.

На абшары Дамброўскага вугальнага раёну, дзе баставалі некаторыя работніцкія групы, выбухлі ў пару мейсцах крывавыя сутычкі работнікаў з паліцэйскімі патрулямі. Агенцкія тэлеграмы кажуць, што работнікі, падбіваныя камуністычнымі агітатарамі, абкідалі паліцыянтаў ня толькі каменьнем, але і рэвальвэрнымі кулямі. Таму паліцыянты ўжылі з свайго боку карабінаў. У выніку сутычак—некалькі работнікаў і паліцыянтаў ранены, а тры работнікі забіты.

Крывавыя здарэньні ў Варшаўскім Унівэрсытэце.

На сабраньні агульна-студэнцкае арганізацыі Братняй Помачы ў Варшаўскім Унівэрсытэце дайшло да вельмі вострых сутычак паміж „эндэцкімі“ студэнцкімі групамі і „бэбэкаўскімі“. У часе бойкі была кінута бомба з душачымі газамі. Уварваўшаяся эндэцкая баёўка была азброена нажамі і палкамі. У выніку—значная колькасьць студэнтаў парэзана ды пабіта.

З украінскага жыцьця.

Навуковы зьезд.

20-24 сакавіка ў Празе Чэскай склікаецца другі ўжо ўкраінскі навуковы зьезд (першы адбыўся ў 1926 годзе). Зьезд мае на мэце зрабіць перагляд навуковае працы ўкраінскае эміграцкае інтэлігенцыі і навуковых працаўнікоў, якія жывуць пад Польшчай. Склікае зьезд Украінскі Акадэмічны Камітэт. На зьезьдзе працавацімуць чатыры сэкцыі:

I. Гістарычна-філёлёгічная—з падсэкцыямі: гістарычнай, філёлёгічнай, філёзофічна-пэдагогічнай і археолёгічна-мастацкай.

II Юрыдычна-эканамічная—з падсэкцыямі: юрыдычна соцыёлёгічнай і эканамічна-каапэратыўнай.

III. Прыродна мэдыцынская—з падсэкцыямі прыроднай і мэдыцынскай.

IV. Тэхнічна матэматычная—з падсэкцыямі: аграномічна-лясной, будаўляна-памернай, фізычна-хімічна-матэматычнай.

Задэклараваныя даклады ўжо друкуюцца—поўнасьцю або ў скарочаньні.

Спадзяюцца чысьленага ўчасьця украінскіх навуковых працаўнікоў з усіх дзяржаў Эўропы дый з Амэрыкі, дзе жывуць і працуюць украінскія эмігранты.

З літоўскага жыцьця.

Абмежаньне правоў літоўскіх школ.

Куратарыум Віленск. Школьнага Округу загадала дырэктаром літоўскіх школаў вярнуць дасюлешнія канцэсіі на вядзеньне школаў. Як тлумачаць польскія газэты, замест адабраных канцэсіяў маюць быць выданы новыя. У новых канцэсіях мае быць зьмешчана забарона прыймаць у літоўскія школы вучняў беларускае, жыдоўскае і інш. нацыянальнасьцяў. Гэтак сама забараняецца прымаць вучняў нялітоўскае нацыянальнасьці ў літоўскую гімназію ім. Вітаўта Вялікага.

Разгон літоўскага сходу.

Як падае „Słowo“, у Вільні паліцыя „разьвязала“ сход літоўскае моладзі, якая гуртуецца каля літоўскае студэнцкае арганізацыі „Viltis“. Сход адбываўся ў салі пры касьцеле сьв. Мікалая.

З Савецкае Беларусі.

Трэба аж пэрсональнай адказнасьці... Як падае „Зьвязда“ з дня 8-га лютага г. г., рад саўгасаў і калгасаў да гэтага часу (ўжо недалёка вясна!) ня выканаў пастаноў урадавых органаў па засыпцы насенных фондаў, дзеля гэтага Народн. Камісарыят земляробства пастанавіў забавязаць кіраўніцтва калгасаў у пяцідзённы тэрмін вылучыць са свайго складу сябру кіраўніцтва, усклаўшы на яго пэрсанальную адказнасьць за стан насенных фондаў.

Хіба дрэнна прыходзіцца калгасьнікам, калі за збор насенных фондаў трэба аж пэрсанальнай адказнасьці.

У тэй-жа с май „Зьвязьдзе“ чытаем у адозьве Савету Народных Камісараў да сэкрэтароў райкомаў і гаркомаў і да старшын райвыканкомаў і гарсаветаў, што (даслоўна): „Дырэктывы ЦК і СНК аб засыпцы веснавых насенных фондаў ня выкананы. Ачыстка насеньня, вываз гною — не арганізаваны. Рамонт трактараў і сель-гасп. інвэнтару праходзіць нездавальняюча“ і г. д. Адным словам, згодна з назовам адозвы — „Дрэнна з насеньнем яравых пасеваў, — веснавая пасеўная кампанія пад пагрозай зрыву“.

Вось відавочны вынік новай паншчыны — калгасьніцтва.

А як там у саўгасах? „У саўгасе „Маладая Гвардыя“ морыць жывёлу — піша „Савецкая Беларусь“ з дня 1 лютага г. г. і падае рад фактаў з жыцьця гэтага саўгасу. Гэтак: „Дагляд за жывёлай зарганізаваны вельмі дрэнна. Рабочая і прадукцыйная жывёла: коні, каровы і маладняк — худыя, ніколі ня чысьцяцца. У выніку дрэннага дагляду жывёла часта хварэе і гіне. Нават рабочы саўгасу — скотнік — заразіўся экзэмай ад хворых цялят. Па віне дырэкцыі

У саўгасе „Маладая Гвардыя“ зноў... у саўгасе згноена 500 цэнтнэраў насеннага жубіву“ і г. д.

Так у саўгасе „Маладая Гвардыя“; тое самае і ў іншых саўгасах, калі часамі і ня горш.

З усяго сьвету.

Конфэрэнцыя ў справе разбраеньня.

Пад нячутны з далечыны грымот гарматаў на Далёкім Усходзе, які кітайская дэлегацыя мела спрытны помысл зрабіць чутным у самай салі конфэрэнцыі — праз радыё! ліюцца ў Жэнэве красамоўныя прамовы першых аратараў сьвету—з гімнамі агульнаму й вечнаму міру, агульнаму й поўнаму разбраеньню. Блізу ўсе дзяржавы прапануюць поўнае скасаваньне бранявосцаў, падводных лодак, авіо-матак (караблёў для аэрапляваў), бомбавых аэрапляваў, поўную забарону хімічнай і бактэрыйнай вайны дый абсолютную нятыкальнасьць у часе вайны цывільнага насяленьня...

Характэрна для ўсёй гэтай аж біючай у вочы няшчырасьці, што навет дэлегат тэй самай Японіі, якая якраз у часе прамовы апошняга бомбардавала з бранявосцаў і аэрапляваў мірнае цывільнае насяленьне кітайскага ўзьбярэжжа, горача далучыўся — ад імя сваей дзяржавы — да гэтых шляхотных пажаданьняў, асабліва ж—да забароны кідаць бомбы з аэрапляваў...

Але з прамовы кожнага дэлегата паасобных дзяржаваў, паміж усіх гэтых пекных пажаданьняў, можна выкрыць тое, да чаго запраўды імкнецца і чым кіруецца кожная дзяржава. Іх мэты — забясьпечыць сабе найбольш карысьці і магчымасьці прыціснуць сваіх ворагаў.

Закон аб меншасьцях у Латвіі.

Латвійскі Сойм разглядаў выданы ўрадам бяз Сойму „языковы закон“, які вельмі абмежывае правы меншасьцяў. Закон адасланы ў камісію.

Паміж іншым, закон забараняе ўжываньне расейскае і нямецкае мовы ў дзяржаўных установах, самаўрадах і некаторых іншых галінах грамадзкага жыцьця (?!).

Выбары ў Ірляндыі.

Парляманцкія выбары ў Ірляндыі далі большасьць рэспубліканскай партыі дэ Валеры. Дэ-Валера, як ведама, зьяўляецца прыхільнікам поўнага скасаваньня ўсялякай лучнасьці Ірляндыі з Брытанскай Імпэрыяй і ператварэньня Ірляндыі ў Рэспубліку.

Сэнсацыйны артыкул румынскага палітыка.

Адзін з найвыдатнейшых палітыкаў, маршал Аварэску, напісаў артыкул, у якім робіць параўнаньне цяперашніх часоў у Румыніі з даўнейшымі часамі ваяводы Кузы, які, як ведама, быў „ссаджаны з трону“. Артыкул зрабіў „сэнсацыю“. У Сойме зараз-жа была пададзена інтэрпэляцыя ўраду, якая пытаецца, што мае зрабіць урад з такім „заклікам ссадзіць з трону караля Кароля“... Прэм'ер ня ведаў, што адказаць. Урадавыя партыі зрабілі маніфэстацыю ў чэсьць караля...

УСЯЧЫНА.

Цікаўны вынаход.

Англійскі маёр збудаваў спэцыяльны прожэктар (электрычную лятарню), „каб лавіць“ ды састрэліваць з неба аэрапляны. Прожэктар гэты, асьвятляючы з вялізарнай сілай на далёкую адлежнасьць неба, наносіць на яго „сетку“, якая дае магчымасьць узяць точны прыцэл з гарматы да аэраплявy. Сьвятло прожэктара можна сабраць на плошчы аднаго мэтра на адлежнасьці некалькіх кілёмэтраў. Такім чынам — можна, прыкладам, уначы чытаць (зразумела ж, праз падзорную трубу) газэту, асьветленую гэтым прожэктарам, з адлежнасьці 8 кілёмэтраў!... Ведама-ж, сіла сьвятла гэтага прожэктара лічыцца мільёнамі сьвечак.

ХРОНІКА.

— **Лекцыя Хв. Ільяшэвіча.** У актовай салі Віл. Бел. Гімназіі ў мінулую нядзелю — у памяць дзесятых угодкаў сьмерці Ядвігіна Ш (Антона Лявіцкага) была прачытана цікаўная лекцыя маладым нашым поэтам Хв. Ільяшэвічам. У сваей лекцыі гр І. даў агляд жыцьця нябожчыка, высьвятліўшы рад цёмных і спрэчных дагэтуль мамэнтаў, а пасьля перайшоў да творчасьці Ядвігіна Ш. Не паўтараючы таго, што ўжо ўсім добра ведама, гр. І. стараўся прааналізаваць псыхолёгію Ядвігіна Ш., адбітую ў ягоных творах. Між іншым, прэлегент затрымаўся на мала ведамай і, на-жаль, незакончанай п весьці Ядвігіна Ш. пад назовам „Золата“, якую стаўляе вельмі высака з мастацкага боку. На заключэньне грам. Эмма Залкінд прачытала некалькі характэрных апавяданьняў памершага пісьменьніка. Сабраная публіка гарачымі воплескамі выказала сваю падзяку лектару Ільяшэвічу і гр. Залкінд.

На эстрадзе, прыгожа прыбранай тканінамі, быў павешаны вельмі ўдатны партрэт Ядвігіна Ш. работы нашага маладога мастака П. Сергіевіча.

Лекцыю ладзіла лекцыйная камісія Бел. Навук. Т-ва.

— **Да абходу 10-лецьця сьмерці Ядвігіна Ш.** Віленская Беларуская Гімназія ў дзень дзесятых угодкаў сьмерці Ядвігіна Ш., 23 лютага, пастанавіла пайсьці на магілу пісьменьніка на магільніку Росса і палажыць на ёй вянок. На магіле меўся прамовіць вучыцель беларускае літэратуры грам. В. Грышкевіч, а школьны аркестр павінен быў зайграць хаўтурны марш.

Аднак, перад самым выхадам вучняў на Россу выясьнілася, што віленскі біскуп выдаў у свой час загад, які забараняе музыку і прамовы цывільных асоб на магілах, дапускаючы толькі прамовы ксяндзоў. Дзеля гэтага дырэктар гімназіі грам. Міхалевіч зьвярнуўся праз тэлефон да біскупа і прасіў аб дазвол на прамову і аркестр. Біскуп дазвол даў, але з тэй умовай, каб прамовіў не вучыцель Грышкевіч, а — кс. Станкевіч, які выкладае ў гімназіі рэлігію каталіком. Паклікаўшы да тэлефону кс. Станкевіча, біскуп яму загадаў („polecił“) прамовіць на магіле Ядвігіна Ш.—Толькі тады вырушыў паход.

На Росьсе прышлося перш ачысьціць магілу ад груды сьнегу, што зрабілі самі вучні. Тады аркестр заіграў хаўтурны марш, а кс. Станкевіч коратка выясьніў, чаму мы памінаем гэтага вялікага мастака слова беларускага. Быў палажаны на магілу вянок з нацыянальнымі йстужкамі, пасьля чаго—заіграўшы другі хаўтурны марш—паход у паднятым настроі вярнуўся ў горад.

— **„Новая арганізацыя школьніцтва ў Польшчы і беларускія школы“.** Замест чарговае лекцыі грам. Самойлы на тэму аб беларускім мастацтве, вызначанае на нядзелю 28 лютага і адкладзенае па просьбе лектара на пазьнейшы час,—у гэту нядзелю лекцыйная камісія Бел. Нав. Т ва ладзіць лекцыю на асабліва актуальную тэму: „Новая арганізацыя школьніцтва ў Польшчы і беларускія школы“, якую прачытае дыр. Р. Астроўскі.

— **Крызіс сярод дробных земляробаў.** Паводле інфармацыяў, апублікаваных газэтай „Słowo“, на агульную суму 7 з паловай мільёнаў злотых пазык, выданых у межах Віленскага ваяводзтва Касамі Стэфчыка, у 1930 г. былі сплачаны 4 617 тысяч злот., знача каля 60 прац. У 1931 годзе з агульнае сумы 8 мільёнаў злот. пазык сплачана ўжо толькі 3 180 тысяч зл., знача—40 прац. Гэтыя цыфры ясна гавораць аб тым, як згалела беларуская вёска, якая галоўным чынам і бярэ пазыкі з гэных Касаў Стэфчыка, ня гледзячы на цяжкія варункі выдачы іх.

— **Лічба безработных у Вільні** дасягае ўжо блізу 6 000 душ (—точна: 5817). Лічба гэтая ўзьцяж узрастае.

— **Крызіс і студэнцтва.** Рэкторат абвясьціў студэнтам жыдом, якія вучацца ў Віленскім Унівэрсытэце, што даваная ім дагэтуль дапамога зьменшана да 30 прац. (—знача, на 70 прац.) раньейшае сумы. „Słowo“, зьмяшчаючы гэту вестку, „абураецца“ на студэнтаў жыдоў, што яны выступілі з пратэстам проці гэтага. Сваё „абурэньне“ орган абшарнікаў тлумачыць тым, што вось студэнты-палякі сядзяць ціха, хоць і ім дапамога зьменшана... на 20 прац.!

Няўжо ж такі запраўды зьменшэньне для ўсіх—роўнае?!

— **Апор уладзе.** Польская прэса адзначае за апошнія дні некалькі прыпадкаў чыннага апору сялян, аказанага ўладзе. Гэтакі факт здарыўся, прыкладам, у в. Івіцах, беніцкае воласьці, дзе паліцыя прыйшла ў хату селяніна Шфрановіча, западозранага ў камунізьме. Шфрановіч, яго сям'я і некалькі усядзяў, схапіўшы калы, кінуліся на паліцыянтаў, адзін з якіх быў цяжка ранены. Надыйшоўшая падмога заарыштавала некалькі нападаўшых,—рэшта разьбеглася.

Падобныя выпадкі здарыліся і ў другіх мясцовасьцях—пры выкрываньні паліцыяй патайных бравароў.

Корэспондэнцыі.

З жыцьця Пружаншчыны.

Жыцьцё нашай мясцовасьці нічым ня розьніцца ад жыцьця іншыхваколіц Заходняй Беларусі. Хіба можа толькі тым, што народ жыве трохі бядней, чым у шмат якіх іншых мясцох Беларусі. Нядаўна адбылася ў нас агульная перапіс насяленьня, якая давяла, што польскія нацыяналістычныя элемэнты зусім не зацікаўлены ў выяўленьні істоты рэчаў і для якіхсьці зусім пабочных мэтаў усімі спосабамі стараюцца адрэзаць частку беларусаў на карысьць польскага народу. Ня ведаю, ці гэтак было ўсюды, але ў нас няведама для чаго была ўведзена ў рубрыку родная мова — „мясцовая гутарка“. Гэта яшчэ-б нічога, каб перапісь вялася людзьмі бесстароньнімі, якім дарага тое, што кажа селянін; але ў большасьці выпадкаў перапіснымі камісарамі былі вучыцялі і ўраднікі, людзі даволі няпрыхільна адносячыяся да беларускага народу. Зусім зразумелая рэч што там, дзе люднасьць ня пісалася адкрыта па несьвядомасьці беларусамі, яны стараліся ўцягнуць іх у рубрыку „мясцовы“, каб хаця такім спосабам зьменшыць лік каранного жыхарства на некарысьць беларусаў. Бывалі такія выпадкі — і то досыць частыя, — што камісары бацькоў пісалі „мясцовымі“, а дзяцей беларусамі, або наадварот. Здараліся бацькі, каранныя беларусы, што пісалі сябе беларусамі, а дзяцей — палякамі, або для палітыкі і сябе запісалі ў лік жыхароў „пануючай нацыі“. Ясная і зразумелая рэч, што, як папярэднія перапісі, таксама і гэтая не даюць зусім точнага паняцьця аб колькасьці Бел. Народу ў Польшчы. Але ўсё ж такі, як ні стараліся паменшыць лічбу беларусаў, усё роўна нічога ня вышла, і ў большасьці аказаліся беларусы і „мясцовыя“, што для нас ня робіць ніякай розьніцы, бо мы ведаем, што гэта ёсьць адна душа беларуская. Усяго ў Пружанскім павеце запісана 23 800 чалавек беларусаў і болей за 57 000 „мясцовых“. Гэта складае абсалютную большасьць насяленьня Пружанскага пав.

На заканчэньне хачу выказаць пару слоў аб адносінах адміністрацыі да беларускае культурнае працы, якія зьмяніліся вельмі рэзка, выяўляючыся ў стаўленьні перашкод беларускім культурным арганізацыям у іх працы. Так Шэвеўскі гурток Т. Б. Ш. спатыкае з боку агульнае адміністрацыі штораз горшыя перашкоды, накіраваныя да ануляваньня культурнае працы гуртка. Беларус.

Рэдактар-выдавец: М. СІНЯУСКІ.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая вул. 22